Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
Н.У.Карчэўская
.2022

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ "СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ"

**спецыяльнасці перападрыхтоўкі**
**2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія**

Мінск, 2022

Складальнік:
*Лапцёнак І.Б., прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрай культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін*

*(пратакол ад 07.09.2022 № 36);*

*Саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў*

*(пратакол ад 22.09.2022 № 8 ).*

**ЗМЕСТ**


| | | |
|---|---|---|
| 1 | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА………………………………………...... | 4 |
| 2 | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………….... | 6 |
| | Канспект лекцый………………………………………………........ | 7 |
| 3 | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………….. | 18 |
| 3.1 | Тэматыка і пералік пытанняў да круглых сталоў……..……..…… | 19 |
| 3.2 | Рэкамендацыі па падрыхтоўцы і правядзенню круглых сталоў…… | 21 |
| 4 | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……………………………….... | 23 |
| 4.1 | Заданні для самастойнай работы слухачоў…..…………………….. | 24 |
| 4.2 | Пытанні для самакантролю…………………………................... | 29 |
| 4.3 | Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі................................. | 33 |
| 5 | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ………………………………………… | 34 |
| 5.1 | Вучэбная праграма…………………………………………………. | 35 |
| 5.2 | Інфармацыйна-метадычная частка………………………………... | 53 |
| 5.3 | Асноўная літаратура……………………..……………………….... | 55 |
| 5.4 | Дадатковая літаратура……………………………………………... | 55 |

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Сучасная літаратура Беларусі” накіравана на засваенне практыка-арыентаваных стратэгій па фарміраванню фонду нацыянальнай літаратуры, на правядзенне культурнай-асветнай работы, арыентаванай на садзейнічанне культурнаму развіццю карыстальнікаў бібліятэк, на распаўсюджанне гуманістычных ідэй і дасягненняў сучаснай літаратуры Беларусі, іх далейшае выкарыстанне у дзейнасці бібліятэкі як інфармацыйнага і сацыякультурнага інстытута грамадства.

Метадычныя рэкамендацыі прадстаўляюць сабой апісанне сістэмы дыдактычных сродкаў навучання па вучэбнай дысцыпліне “Сучасная літаратура Беларусі”. Арганізацыя выкладання вучэбнага матэрыялу спрыяе фармаванню ў слухачоў прафесійна кампетэнцый, накіраваных на актыўнае выкарыстанне ведаў і ўменняў, атрыманых на аснове вывучэння ідэйна-эстэтычнай, стылявой, жанрава-тэматычнай, полілінгвістычнай і культурнай адметнасці сучаснай літаратуры Беларусі.

Мэта прадстаўленых метадычных рэкамендацый – сістэматызацыя вучэбна-метадычных матэрыялаў, якія адлюстроўваюць важныя аспекты, звязаныя з выяўленнем і рэалізацыяй інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэк, ажыццяўлення культурна-асветнай работы шляхам вывучэння заканамернасцей і асаблівасцей літаратурна-мастацкага працэсу сучаснага перыяду развіцця літаратуры Беларусі, іх засваенне кіруючымі работнікамі і спецыялістамі бібліятэчнай справы Рэспублікі Беларусь, слухачамі спецыяльнасці перападрыхтоўкі 2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія.

Задачы прадстаўленых метадычных рэкамендацый:

фарміраванне ўяўлення аб ідэйна-мастацкіх здабытках і творчых пошуках сучаснай літаратуры Беларусі;

упарадкаванне працэсу вывучэння вучэбнай дысцыпліны з улікам патрабаванняў, якія прад’яўляюцца да вучэбных заняткаў (арганізацыя, правядзення, інфармацыйна-метадычнае суправаджэнне; прымяненне метадаў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці слухачоў);

забеспячэнне арганізацыі самастойнай вучэбнай дзейнасці і кантролю ведаў слухачоў;

аказанне слухачам метадычнай дапамогі ў засваенні вучэбнага матэрыялу;

аказанне выкладчыкам метадычнай дапамогі, неабходнай і дастатковай для арганізацыі адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне на высокім навукова-метадычным узроўні.

**У тэарэтычным раздзеле** змяшчаны кароткі канспект лекцый, матэрыялы па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

**Практычны раздзел** уключае пералік тэм і пытанняў, якія выносяцца на абмеркаванне на круглым стале.

**У раздзеле кантролю ведаў** прадстаўлена тэматыка заданняў для самастойнай працы слухачоў.

Пытанні да самакантролю сфармуляваны ў адпаведнасці са змястоўным кампанентам тэматычнага плана вучэбнай праграмай. У іх уключаны і заданні, якія выносяцца на самастойную работу слухачоў.

**Дапаможны раздзел** уключае вучэбную праграму, пералік вучэбных выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў, якія рэкамендуюцца для вывучэння вучэбнай дысцыпліны (спісы асноўнай і дадатковай літаратуры).

Для павышэння эфектыўнасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны рэкамендуецца прымяненне педагагічных тэхналогій для актывізацыі разумовай дзейнасці слухачоў – праблемнае навучанне, гульнявыя тэхналогіі і інш., для папяховасці арганізацыі вучэбнага працэсу – тэхналогія паэтапнага фарміравання разумовых дзеянняў, тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці і інш.

У выніку засваення дысцыпліны слухач павінен ведаць асновы забеспячэння бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк (па пытаннях сучаснай літаратуры Беларусі) згодна з іх патрабаваннямі і інтарэсамі; умець прымяняць атрыманыя тэарэтычныя веды ў галіне фарміравання нацыянальнага бібліятэчнага фонду для рашэння практычных задач.

Для вывучэння дысцыпліны “Сучасная літаратура Беларусі” прадугледжана 30 вучэбных гадзін, якія ўключаюць 16 вучэбных гадзін аўдыторных заняткаў (з іх 10 вучэбных гадзін – лекцыі, 2 вучэбныя гадзіны – практычны занятак, 4 вучэбныя гадзіны – круглы стол); 14 вучэбных гадзін – самастойная работа слухачоў.

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

# КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

## РАЗДЗЕЛ 1 АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ І ЖАНРЫ СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ

### Тэма 1.1 Сучасная літаратура Беларусі як аб'ект рэцэпцыі: своеасаблівасць мадэлявання ў прасторы культуры

*План:*

1. Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай літаратуры другой паловы XX ст.
2. Прыход у літаратуру прадстаўнікоў "філалагічнага пакалення".
3. Сучасная крытыка і літаратуразнаўства. Асноўныя кірункі даследавання на сучасным этапе.
4. Праблемы пераемнасці сучаснага этапу літаратурнага развіцця з папярэднім.
5. Адметнасць розных эстэтыка-выяўленчых кірункаў, плыняў, тэндэнцый у сучаснай літаратуры.
6. Літаратурна-выдавецкі працэс у сучаснай Беларусі.
7. Авангардныя пошукі творчай моладзі.

Сучасны перыяд літаратурнага развіцця як этап творчага разняволення асобы, узбагачэння літаратуры новымі тэмамі і жанрамі, паглыблення яе аналітызму, агульначалавечага пафасу, агульнагуманістычнай канцэпцыі жыцця.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця літаратуры другой паловы 1950-х –першай паловы 1980-х гг.

Прыход у літаратуру прадстаўнікоў "філалагічнага пакалення" – У. Караткевіча, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, С. Гаўрусёва, Б. Сачанкі, В. Адамчыка, І. Пташнікава, І. Чыгрынава, А. Грачанікава.

Сучасная крытыка і літаратуразнаўства: асноўныя кірункі даследавання на сучасным этапе. Праблематыка даследаванняў А. Адамовіча, Р. Бярозкіна, У. Калесніка, А. Лойкі, Г. Кісялёва, У. Гніламёдава, С. Лаўшука, М. Мішчанчука і інш.

Традыцыі і наватарства ў сучаснай літаратуры. Праблемы пераемнасці сучаснага этапу літаратурнага развіцця з папярэднім. Актывізацыя літаратурнага працэсу пасля "адлігі". Падзеі і з'явы, якія аказалі ўплыў на развіццё літаратуры. Чарнобыль як новае вымярэнне мінулага і сучаснага.

Беларуская літаратура ў цеснай узаемасувязі з іншымі літаратурамі, узбагачэнне лепшымі традыцыямі сусветнага мастацтва, мастацкімі дасягненнямі. Развіццё беларускай паэзіі, прозы і драматургіі па шляху інтэнсіўнага творчага ўзбагачэння.

Адметнасць розных эстэтыка-выяўленчых кірункаў, плыняў, тэндэнцый у сучаснай літаратуры: рэалізму, неарамантызму, авангардызму, імпрэсіянізму, постмадэрнізму і інш.

Адкрыццё праўды пра гісторыю народа і лёс чалавека ў ХХ ст. Уплыў чарнобыльскай трагедыі на погляды і светаадчуванне беларускіх пісьменнікаў. Трывога літаратуры пра вечныя духоўныя каштоўнасці, захаванне гуманізму. Уплыў "вернутай літаратуры" на літаратурны працэс канца ХХ ст. Сучаснае прачытанне літаратурнай спадчыны.

Літаратурна-выдавецкі працэс у сучаснай Беларусі. СМІ ў беларускай культурнай прасторы. Літаратурны перыядычны друк (газета "Літаратура і мастацтва", часопісы "Полымя", "Маладосць", "Неман" і інш.).

Творчыя аб'яднанні і літаратурныя суполкі ("Узлёт", "Тутэйшыя", "Бум-Бам-Літ", "Літаратурнае прадмесце" і інш.).

Авангардныя пошукі творчай моладзі. Сучасная літаратура і інтэрнэт як новы спосаб узаемаадносін з чытачом. Літаратурныя блогі ў інтэрнэце: новыя формы і жанры. Сучасныя літаратурныя прэміі.

Культурны патэнцыял і геапаэтыка. Геапаэтыка як інструмент у асэнсаванні літаратурнай спадчыны (памяць пакінутай прасторы, вобразы геаграфічнай прасторы ў творчасці пісьменніка, літаратурная ўрбаністыка). Паняцце "малая радзіма пісьменніка", у аснове якога знаходзіцца ідэнтыфікацыя з месцам, якое выконвае важную ролю ў фарміраванні асобы пісьменніка. Мастацкі пераклад як сродак, які пашырае літаратурную геаграфію.

*Дадатковыя дакументныя крыніцы для вывучэння праблемнага поля тэмы вучэбнай дысцыпліны:*

1. Адлюстраванне сучаснай Беларусі ў мастацкай літаратуры: зб. навук. арт. / уклад. Н. В. Якавенка; навук. рэд. І. В. Саверчанка; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2020. – 157 с.

2. Бараноўскі, А. А. Беларуская філасофская лірыка мяжы ХХ–ХХІ стагоддзяў / А. Бараноўскі; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 165 с.

3. Бароўка, В. Ю. Аксіялогія беларускай літаратуры : манаграфія / В. Ю. Бароўка. – Віцебск : ВДУ, 2020. – 183 с.

4. Бароўка, В. Ю. Актуалізацыя творчасці класікаў як аксіялагічны феномен у сучаснай беларускай літаратуры / В. Ю. Бароўка // Аксиологический диапазон художественной литературы : сб. науч. статей [по материалам междунар. науч. конф.]. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2020. – С. 35–38.

5. Лаптенок, И. Б. Культурный потенциал и геопоэтика / И. Б. Лаптенок // Культурный потенциал Республики Беларусь: методологические основания и практический опыт выявления, фиксации и систематизации культурных ресурсов : [монография] / И. Б. Лаптенок, О. А. Галкин, И. Г. Голубева ; под

общ. ред. И. Б. Лаптенок ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2019. – С. 31–35.

6. Пісарэнка, А. М. “Слова – усяго аснова”: мова і літаратура як важнейшыя сродкі ў прафесійнай падрыхтоўцы работнікаў сферы культуры [Электронный ресурс] / А. М. Пісарэнка, В. С. Варапаева // Практико-ориентированный подход в подготовке специалистов сферы культуры : материалы науч.-метод. конф. профессорско-преподавательского состава, 1 февраля 2018 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск, 2018. – 1 элект. опт. диск (CD-ROM). – Депонировано в БГУКИ 19.12.2018, № 035519122018. – Режим доступа: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/19907?show=full. – Дата доступа: 03.06.2022.

7. Рагачэўская, М. С. Сучасная беларуская літаратура і свет / М. С. Рагачэўская // Материалы ежегодной научной конференции преподавателей и аспирантов университета, 17–27 апреля 2020 г. : в 5 ч. – Минск : МГЛУ, 2020. – Ч. 5. – С. 51–53.

8. Сучаснае беларусазнаўства : новуковыя парадыгмы мовы і літаратуры : зб. навук. арт. – Гомель : ГДУ, 2019. – 153 с.

9. Шамякина, Т. И. Стратегия целостного подхода в литературоведческом дискурсе / Т. И. Шамякина // Актуальныя праблемы сучаснага літаратурнага працэсу : матэрыялы Рэсп. навук-практ-канф., Брэст, 20 лістап. 2019 г. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна ; рэдкал.: Л. В. Левенцэвіч, Т. А. Кісель, Н. Р. Якубук ; пад агул. рэд. Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : БрДУ, 2020. – 281 с. – С. 114–118.

**Тэма 1.2 Ідэйна-эстэтычная і стылявая адметнасць сучаснай беларускай паэзіі**

*План:*

1. Жанравая і тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.
2. Эстэтычна-стылявыя плыні.
3. Традыцыя філасафізму і яе ўплыў на сучасную паэзію.
4. Сувязь сучаснай паэтычнай міфатворчасці з фальклорнай і біблейскай традыцыямі.
5. Экалагічная тэма ў сучаснай беларускай паэзіі (М. Танк, Р. Барадулін, М. Мятліцкі, С. Законнікаў і інш.).
6. Адметнасць жаночай паэзіі.
7. Паэтычныя слэмы як інтэрактыўная з’ява сучаснага літаратурнага жыцця.
8. Відэавершы як злучэнне традыцыйнага віду літаратурнай творчасці з тэхналагічнымі магчымасцямі інфармацыйнага грамадства.

Сучасная беларуская паэзія як поліфанічная і шматгранная з’ява.

Шырокі праблемна-тэматычны дыяпазон сучаснай паэзіі, выяўленне ў ёй шматстайнасці зместу жыцця: духоўнага, сацыяльнага, маральна-філасофскага.

Жанравая і тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.

Эстэтычна-стылявыя плыні: лірыка-апавядальная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная, інтэлектуальная (Л. Дранько-Майсюк, А. Бадак, Л. Рублеўская і інш.).

Паяднанне публіцыстычнага, філасофскага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у сучаснай лірыцы (П. Панчанка, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі і інш.).

Традыцыя філасафізму і яе ўплыў на сучасную паэзію. Інтэлектуальна-філасофская плынь у паэзіі, адлюстраванне біблейска-філасофскіх, рэлігійна-хрысціянскіх і экзістэнцыяльных матываў (М. Танк, В. Зуёнак, С. Дзяргай, А. Русецкі, У. Караткевіч, А. Вярцінскі, П. Макаль і інш.).

Сівая мінуўшчына і анталагічныя праблемы ў творчасці М. Арочкі, А. Лойкі, В. Жуковіча, В. Макарэвіча, В. Коўтун і інш.

Сувязь сучаснай паэтычнай міфатворчасці з фальклорнай і біблейскай традыцыямі. Вобразы беларускай міфалогіі (М. Танк, Р. Барадулін, А. Мінкін, А. Сыс і інш.).

Экалагічная тэма ў сучаснай беларускай паэзіі (М. Танк, Р. Барадулін, М. Мятліцкі, С. Законнікаў і інш.).

Грамадзянска-публіцыстычная і патрыятычная лірыка (П. Панчанка, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, С. Гаўрусёў, Д. Бічэль-Загнетава, А. Сыс, В. Шніп і інш.). Спалучэнне асабістага і грамадскага, вечнага і сучаснага, нацыянальнага і агульначалвечага.

Багацце духоўнага зместу ў лірыцы кахання (Я. Янішчыц, Р. Баравікова, Г. Бураўкін і інш.). Адметнасць жаночай паэзіі (І. Багдановіч, Л. Рублеўская, Л. Сільнова і інш.). Глыбіня вобразаў, шчырасць і спавядальнасць.

Сатырычная паэзія. Паэма “Сказ пра Лысую гару”: увасабленне традыцый народнага смеху і гумару.

Сучасная беларуская паэма як сінтэтычны жанр, багацце як форм і жанравых адгалінаванняў (ліра-эпічная, драматычная, лірыка-публіцыстычная, філасофская і інш.). Паэмы ў прозе Я. Сіпакова (“Хата”, “Одзіум”), Р. Барадуліна (“Самота паломніцтва” і інш.).

Творчасць бумбамлітаўцаў. Пошукавы характар паэзіі. Калектыўны зборнік хоку беларускіх паэтаў “Круглы год” (1996). Паэзія маладых у зборніку “Літаратурны квартал” (2003) і інш.

Паэтычныя слэмы як інтэрактыўная з’ява сучаснага літаратурнага жыцця.

Відэавершы як злучэнне традыцыйнага віду літаратурнай творчасці з тэхналагічнымі магчымасцямі інфармацыйнага грамадства.

*Дадатковыя дакументныя крыніцы для вывучэння праблемнага поля тэмы вучэбнай дысцыпліны:*

1. Калядка, С. У. Літаратуразнаўчая тэорыя паэтычнай эмоцыі / С. У. Калядка. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 350 с.

2. Садко, Л. М. Белорусская экспериментальная поэзия второй половины XX – начала XXI века и немецкоязычный конкретизм : монография / Л. М. Садко. – Брест : БрГУ, 2018. – 183 с.

3. Сінькова, Л. "З Бум-Бам-Літа!" / Л. Сінькова // Літаратура і мастацтва. – 2018. – 19 студзеня. – С. 2.
4. Скарапанава, І. С. Поставангардызм Віктара Жыбуля / І. С. Скарапанава. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2018. – 97 с.
5. Шматкова, І. І. Беларуская жаночая паэзія другой паловы XX ст. – Мінск : РІВШ, 2017. – 142 с.

**Тэма 1.3 Жанравая і тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай прозы**

*План:*

1. Разнастайнасць жанравай сістэмы сучаснай беларускай прозы.
2. Дакументалізм, аўтабіяграфізм і лірызм як рысы сучаснай прозы апошніх дзесяцігоддзяў.
3. Тэма гістарычнага мінулага ў беларускай прозе.
4. Адметнасць экалагічнай тэматыкі ў беларускай прозе.
5. Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры.
6. Сучасная "спавядальная" проза.
7. Фантастычны элемент у сучаснай беларускай прозе.
8. Сучасная беларуская проза для падлеткаў.
9. Фармальна-стылявыя пошукі і эксперыменты ў прозе.

Мастацкі патэнцыял сучаснай прозы, яе філасофская і гуманістычная канцэптуальнасць, гістарычная і псіхалагічная глыбіня мыслення. Актывізацыя ідэйна-творчых пошукаў, пашырэнне выяўленчых магчымасцей сучаснай беларускай прозы. Разнастайнасць жанравай сістэмы сучаснай беларускай прозы.

Маладая беларуская проза і "еўрапеізм". Укараненне вядомых у свеце жанрава-стылявых форм. Нараджэнне новых жанраў (філалагемы, фрэскі, мроі, жыццясны і інш.).

Дакументалізм, аўтабіяграфізм і лірызм як выразныя рысы сучаснай прозы апошніх дзесяцігоддзяў. Тэматыка і праблематыка сучаснай прозы.

Тэма гістарычнага мінулага ў беларускай прозе (В. Іпатава, Л. Дайнека, В. Чаропка і інш.). Мінулае Беларусі ў творчасці У. Караткевіча, наватарства пісьменніка і яго ўплыў на прадстаўнікоў маладзейшых літаратурных пакаленняў. Новыя падыходы ў мастацкім асэнсаванні ваеннага мінулага (А. Адамовіч, В. Быкаў, І. Шамякін, І. Чыгрынаў і інш.). Асаблівасць сучаснай аўтабіяграфічнай прозы. Творы, напісаныя на мемуарным матэрыяле.

Чарнобыльская трагедыя, экалагічная тэматыка: творы В. Казько, А. Жука, В. Карамазава, І. Пташнікава, І. Шамякіна і інш. Карціны вясковага жыцця ў творах А. Казлова, А. Жука, В. Казько, У. Гніламёдава і інш. Адлюстраванне ўрбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах. Іранічны сац-арт.

Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры. Працяг традыцый У. Караткевіча: займальны сюжэт, прынцып загадкавасці, вострая інтрыга,

незвычайнасць вобразаў. Праблематыка і асаблівасці аўтарскай канцэпцыі ў творах Л. Рублеўскай, М. Чаргінца і інш. Сучасная “спавядальная” проза. Узбагачэнне беларускай фантастыкі (Л. Дайнека, Я. Сіпакоў і інш.). Фантастычны элемент у сучаснай беларускай прозе. Сучасная беларуская проза для падлеткаў.

Мастацкія метады ў творчасці пісьменнікаў (рэалізм, мадэрнізм, постмадэрнізм). Набліжэнне рэалістычных твораў да парабалы, прытчы, алегорыі, прыпавесці і метафары, схільнасць да міфатворчасці (В. Казько, В. Быкаў, Я. Сіпакоў і інш.). Літаратурныя прыпавесці (Я. Сіпакоў) і лірычныя мініяцюры (Я. Брыль). Тэндэнцыі постмадэрнізму і іх выяўленне ў творчасці пісьменнікаў. Фармальна-стылявыя пошукі і эксперыменты ў прозе.

*Дадатковыя дакументныя крыніцы для вывучэння праблемнага поля тэмы вучэбнай дысцыпліны:*

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2003.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 3. – Мінск : Беларус. навука, 2015.

3. Жанравая дынаміка і вобразны свет беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзя : зб. матэрыялаў Рэсп. нав.-практ. канф., прысв. 100-годдзю з дня нараджэння Янкі Брыля і 95-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Калесніка, г. Брэст, 26 кастр. 2017 г.; пад агул. рэд. У. А. Сенькаўца. – Брэст : БрДУ, 2018. – 203 с.

4. Жанр рамана ў літаратуразнаўстве і літаратуры / склад. Г. В. Навасельцава. – Віцебск : ВДУ, 2021. – 43 с.

5. Казка ў еўрапейскай прасторы: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. форуму даследчыкаў беларускай казкі ; Мінск, 17–18 мая 2018 г. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; склад. Я. І. Грыневіч ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2019. – 303 с.

6. Навасельцава, Г. В. Жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя : манаграфія / Г. В. Навасельцава. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2020. – 268 с.

7. Рагачэўская, М. С. Новая беларуская літаратура: духоўная проза / М. С. Рагачэўская // Материалы ежегодной научной конференции преподавателей и аспирантов университета, 15–16 апреля 2021 г. : в 5 ч. – Минск : МГЛУ, 2021. – Ч. 3. – С. 118–121.

## Тэма 1.4 Традыцыі і наватарства сучаснай беларускай драматургіі

*План:*

1. Агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі.
2. Традыцыі нацыянальнай і сусветнай драматургіі ў п'есах з гістарычнай тэматыкай.
3. Драматургічны "поп-арт".
4. Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі.
5. Набыткі драматургаў новай генерацыі.
6. Праблемы рэпрэзентацыі твораў драматургіі.

Сучасны перыяд у развіцці драматургіі: тэматычная шматграннасць, глыбіня псіхалагізму ў раскрыцці характараў, сацыяльная і маральная вастрыня зроку ў раскрыцці складаных пытанняў, праблем быцця чалавека і грамадства.

Агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі: пашырэнне тэматыкі, пошук новых жанравых форм, мастацкіх сродкаў увасаблення рэчаіснасці. Узмацненне ўвагі да набыткаў сусветнага драматургічнага і тэатральнага мастацтва.

Традыцыі нацыянальнай і сусветнай драматургіі ў п'есах з гістарычнай тэматыкай. Гістарычныя рэтраспекцыі, інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных падзей і асоб у творах І. Чыгрынава, А. Дударава, А. Петрашкевіча, У. Бутрамеева, Р. Баравіковай і інш. Сацыяльна-маральная завостранасць канфлікту ў п'есах М. Матукоўскага.

Тэндэнцыі засваення паэтыкі мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага тэатра. Драматургічны "поп-арт". Трансфармацыя рэальнасці, спалучэнне несумяшчальнага. Перапрацоўка вядомых сюжэтаў, матываў, вобразаў. Надзённыя канфлікты жыцця, спецыфіка іх вырашэння.

Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі (п'еса-прытча, п'еса-фантасмагорыя, п'еса-містыфікацыя, п'еса-казка для дарослых). "Рыцарская" п'еса (Л. Рублеўская, П. Васючэнка і інш.). Набыткі і страты драматургаў новай генерацыі.

Праблемы рэпрэзентацыі твораў драматургіі.

*Дадатковыя дакументныя крыніцы для вывучэння праблемнага поля вучэбнай дысцыпліны:*

1. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2003.
2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 3. – Мінск : Беларус. навука, 2015.
3. Мартынкевіч, С. В. Беларуская мова і літаратура : метадычныя рэкамендацыі / С. В. Мартынкевіч. – Віцебск : ВДУ, 2021. – 59 с.

## РАЗДЗЕЛ 2 ПОЛІЛІНГВІСТЫЧНАСЦЬ ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ І ЯЕ СУВЯЗІ З ІНШЫМІ ЛІТАРАТУРАМІ СВЕТУ

### Тэма 2.1 Гістарычныя асаблівасці развіцця полілігвізму. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі

*План:*

1. Сітуацыя полілінгвізму ў літаратуры Беларусі.
2. Літаратура беларускага замежжа.
3. Рускамоўная літаратура Беларусі.
4. Роля і месца рускамоўнай прозы ў літаратурным працэсе.
5. Рускамоўная паэзія: жанрава-стылявая разнастайнасць.
6. Рускамоўная драматургія на мяжы XX – XXI стст.

Сітуацыя полілінгвізму ў літаратуры Беларусі. Стварэнне мастацкіх твораў на розных мовах: рускай, польскай, ідыш, іспанскай, нямецкай, курдскай, армянскай і інш.

Літаратура беларускага замежжа як неад'емная частка нацыянальнага літаратурнага працэсу. Папулярызатары беларускай мастацкай літаратуры за мяжой: В. Жыдліцкі, Ч. Сэнюх, Н. Вылчаў і інш.

Выхад беларускай літаратуры за межы нацыянальнай традыцыі, падключэнне да эстэтычных сістэм еўрапейскага і сусветнага мастацтва. Міжнародныя літаратурныя сувязі і кантакты.

Уганараванне дзяржаўнымі ўзнагародамі і літаратурнымі прэміямі іншых краін беларускіх пісьменнікаў.

Выхад анталогій беларускай паэзіі ў Расіі, Балгарыі, Югаславіі і інш. Анталогія “Туга па Радзіме” (1992).

Літаратурны друк на рускай мове. Пісьменнікі, якія пісалі ці пішуць на дзвюх або некалькіх мовах.

Роля і месца рускамоўнай прозы ў літаратурным працэсе (А. Андрэеў, М. Чаргінец, У. Гніламёдаў і інш.). Рускамоўная паэзія: жанрава-стылявая разнастайнасць (В. Блажэнны, В. Паліканіна і інш.). Рускамоўная драматургія на мяжы XX – XXI стст.

*Дадатковыя дакументныя крыніцы для вывучэння праблемнага поля тэмы вучэбнай дысцыпліны:*

1. Аўласенка, І. М. Беларускія пісьменнікі ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый : выступленні, назіранні, уражанні / І. М. Аўласенка. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2021. – 305 с.

2. Булацкая, Н. А. Да пытання аб нацыянальна-беларускім успрыманні рускай літаратуры [Электронны рэсурс] / Н. А. Булацкая // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : сборник научных статей : XII Межд. науч.-практ. конф., Минск, 3 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2018. – Вып. 12. – С. 122–125. –

Рэжым доступу: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/18981?show=full. – Дата доступу: 03.06.2022.
3. Драздова, З. У. Маляўнічая сіла слова : беларуская і руская проза XX–XXI ст.: параўнальна-тыпалагічны кантэкст / З. У. Драздова. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 256 с.
4. Жиганова, М. П. “Спешите медленнее жить…” А. Ю. Аврутин : жизнь и творчество / М. П. Жиганова. – Брест : БрГТУ, 2018. – 271 с.
5. Карлюкевіч, А. Літаратурнае пабрацімства : Беларусь –Казахстан / А. Карлюкевіч ; прадмова С. Ананьевай. – Мінск :Звязда, 2020. – 176 с.
6. Карлюкевіч, А. Пуцявінамі зорак : ураджэнцы Беларусі ў блізкім памежжы / А. Карлюкевіч. — Мінск : Звязда, 2022. — 318 с.
7. Поэзия русского слова: антология современной русско-язычной поэзии Беларуси. В 2 т. Т. 1 / авторы проекта: Владимир Гниломедов, Микола Микулич; редкол.: В. В. Гниломедов [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2019. – 829 с.

**Тэма 2.2 Мастацкая літаратура ў перакладзе**

*План*:
1. Сутнасць і віды мастацкага перакладу.
2. Умовы і цяжкасці мастацкага перакладу.
3. Пераклад і ўзаемасувязі літаратур: набыткі, праблемы і перспектывы.
4. Тэндэнцыі развіцця сучаснага беларускага мастацкага перакладу.
5. Перакладчыцкія структуры і выданні.
6. Беларуская школа мастацкага перакладу.

Сутнасць мастацкага перакладу. Перакладазнаўства як навука. Пераклад мастацкі як 1) від літаратурна-мастацкай творчасці, узнаўленне твора, напісанага на адной мове, выяўленчымі сродкамі другой мовы; 2) літаратурны твор, што з'яўляецца адпаведнікам іншамоўнаму твору (арыгіналу). Адрозненне мастацкага перакладу ад іншых відаў (грамадска-палітычнага, навукова-тэхнічнага): творчая сутнасць, блізкасць да арыгінальнай творчасці.

Падзел мастацкага перакладу паводле характару стаўлення да арыгінала: аўтарскі (аўтапераклад) – пераклад, выкананы аўтарам арыгінала, аўтарызаваны (ухвалены і падпісаны аўтарам), вольны (з адступленнямі ад сэнсу ці формы арыгінала), даслоўны (пераклад “слова ў слова”), падрадковы (даслоўны пераклад, без захавання формы – рытму, рыфмаў і г.д.), дакладны (рэалістычны пераклад).

Перакладазнаўства ў межах параўнальнага мовазнаўства Уключэнне мастацкага перакладу ў вывучэнне літаратурных узаемасувязей, кантактнага ўзаемадзеяння літаратур. Перакладныя слоўнікі: “Русско-белорусский словарь” (2012), “Беларуска-рускі слоўнік” (2012), “Польска-беларускі слоўнік” (2004), “Ангельска-беларускі слоўнік” (2006) і інш.

Адметныя праблемы мастацкага перакладу. Уплыў на характар і ўзровень мастацкага перакладу ступені развітасці нацыянальнай літаратуры,

распрацаванасці літаратурнай мовы, яе разнастайных стыляў, багацця перакладчыцкіх традыцый, моўнай, этнаграфічна-бытавой, культурнай блізкасці краін і народаў. Шэраг спецыфічных цяжкасцей мастацкага перакладу (міжмоўная аманімія, гіпноз арыгінала і інш.).

Жанры і жанравыя разнавіднасці мастацкага перакладу. Празаічны і паэтычны пераклад. Адметнасць узнаўлення з далёкіх, рознасістэмных моў, з блізкіх, блізкароднасных моў.

Асаблівасці ўзнаўлення паэзіі (эквіметрычнасць, эквірыфменнасць, эквілінеарнасць).

Мастацкі пераклад як своеасаблівы акт сяброўства паміж народамі і пісьменнікамі розных краін, сродак узаемаўзбагачэння літаратур. Пераклад і ўзаемасувязі літаратур: набыткі, праблемы і перспектывы. Узнаўленне твораў беларускай літаратуры на мовы свету (на рускую мову – М. Ісакоўскі, А. Твардоўскі, А. Пракоф’еў, У. Раждзественскі, Д. Кавалёў, Я. Хялемскі, І. Шклярэўскі, Н. Кіслік, В. Тарас, на ўкраінскую – М. Драй-Хмара, М. Рыльскі, Г. Кочур, П. Тычына, Д. Паўлычка, Р. Лубкіўскі, на польскую – Т. Хрусцялеўскі, Я. Гушча, З. Нядзеля, на англійскую – В. Рыч, У. Мэй, на іспанскую – К. Шэрман і інш.).

Тэндэнцыі развіцця сучаснага літаратурнага перакладу ў Беларусі. Фарміраванне і развіццё сучаснага беларускага мастацкага перакладу. Дзейнасць Ю. Гаўрука, Я. Семяжона, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, В. Сёмухі, К. Цвіркі і інш. Тэорыя мастацкага перакладу. Погляды С. Александровіча, М. Кенькі, В. Рагойшы, А. Яскевіча, П. Копанева і інш. Крытыка мастацкага перакладу. Артыкулы і рэцэнзіі М. Арочкі, Р. Бярозкіна, Л. Казыры, У. Калесніка, В. Небышынца, В. Нікіфаровіча, І. Чароты, К. Шэрмана і інш.

Перакладчыцкія структуры і выданні (часопісы, альманахі, кніжныя серыі, хрэстаматыі па літаратуры народаў свету).

Пераклады біблейскіх тэкстаў, зробленыя А. Клышкам і В. Сёмухам. Анталогіі польскай паэзіі Я. Чыквіна і А. Лойкі. Пераклад на беларускую мову славутых паэтаў і пісьменнікаў славянскага свету.

Перакладчык як творчая індывідуальнасць. Мастацкі пераклад і развіццё арыгінальнай творчасці.

Беларуская школа мастацкага перакладу. Творчая дзейнасць найбольш значных прадстаўнікоў сучаснага беларускага мастацкага перакладу. Прынцыпы мастацкага перакладу Ю. Гаўрука, У. Дубоўкі, К. Чорнага, П. Броўкі, П. Глебкі, А. Дудара, Ю. Таўбіна і інш. Беларускі рэалістычны пераклад у пасляваенныя гады: перакладчыцкі талент А. Куляшова, М. Танка, Я. Брыля, М. Лужаніна, Р. Барадуліна, П. Бітэля, А. Зарыцкага, Н. Гілевіча, В. Коўтун, А. Лойкі, П. Макаля, Н. Мацяш, А. Разанава, Я. Семяжона, В. Сёмухі, Я. Сіпакова, У. Скарынкіна, А. Траяноўскага, К. Цвіркі і інш.

Гісторыя і тэорыя беларускага мастацкага перакладу: уклад С. Александровіча, А. Вераб’я, М. Кенькі, П. Копанева, Ц. Ліякумовіча, Э. Мартынавай, В. Рагойшы, А. Яскевіча і інш.

Крытыка перакладу (артыкулы і рэцэнзіі М. Арочкі, Р. Бярозкіна, Т. Кабржыцкай, Л. Казыры, У. Калесніка, В. Небышынца, В. Нікіфаровіча,

І. Чароты, К. Шэрмана і інш.). Уплыў гісторыі, тэорыі і крытыкі мастацкага перакладу на перакладчыцкую практыку: здабыткі і праблемы.

*Дадатковыя дакументныя крыніцы для вывучэння праблемнага поля тэмы вучэбнай дысцыпліны:*

1. Лапцёнак, І. Б. Мастацкі пераклад паэзіі Янкі Купалы ў монавыданнях : адметнасць рэпрэзентацыі / І. Б. Лапцёнак // Культура. Наука. Творчество : XVI Междун. науч.-практ. конф. ; Минск, 12 мая 2022 г. : сб. науч. ст. / Бел. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2021. – [Вып. 16]. – С.154–158.

2. Лапцёнак, І. Б. Мастацкі пераклад як адметная форма ўзаемадзеяння нацыянальных літаратур і культур / І. Б. Лапцёнак // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : сб. науч. ст. по материалам III Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12–13 апреля 2018 г. / редкол. : С. Ю. Лебедев (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Колорград, 2018. – С. 455–460.

3. Лапцёнак, І. Б. Праблема эквівалентнасці ў паэтычным перакладзе / І. Б. Лапцёнак // Літаратуразнаўства. Фальклырыстыка : вучэб.-метад. дапам. / склад. А. У. Вострыкава [і інш.] ; пад рэд. В. П. Рагойшы, І. А. Чароты. – Мінск : БДУ, 2020. – С. 110–127.

4. Рагойша, В. П. Мастацкі пераклад: тэарэтычны аспект / В. П. Рагойша // Літаратуразнаўства. Фальклырыстыка: вучэб.-метад. дапам. В. П. Рагойша [і інш.]; пад рэд. В. П. Рагойшы, І. А. Чароты. – Мінск : БДУ, 2020. – С. 74–85.

5. Рагойша, В. П. Параўнальная паэтыка і мастацкі пераклад / В. П. Рагойша // Літаратуразнаўства. Фальклырыстыка : вучэб.-метад. дапам. В. П. Рагойша [і інш.]; пад рэд. В. П. Рагойшы, І. А. Чароты. – Мінск : БДУ, 2020. – С. 86–108.

6. Тарасава, К. А. Беларускі мастацкі пераклад як сродак утварэння міжнародных літаратурных сувязяў / К. А. Тарасава // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы XIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нарадж. чл.-кар. НАН Беларусі праф. А. А. Лойкі, Мінск, 28–29 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Важнік (гал. рэд.) [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Бельскі. – Мінск : БДУ, 2021. – С. 209–212.

7. Чарота І. А. Даляглялы’2019: Замежная літаратура / уклад. А. Карлюкевіча, В. Шніпа. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2019. – С. 174–203.

8. Якавенка, Н. В. Мастацкі пераклад з роднасных моў у гісторыі беларускай літаратуры / Н. В. Якавенка ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2019. – 357 с.

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 ТЭМАТЫКА І ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА КРУГЛЫХ СТАЛОЎ

### Круглы стол

### Тэма 1.1 Сучасная літаратура Беларусі як аб’ект рэцэпцыі: своеасаблівасць мадэлявання ў прасторы культуры

*Ключавыя словы:* агульначалавечы пафас, агульнагуманістычная канцэпцыя, тэндэнцыі развіцця літаратуры, традыцыі і наватарства ў літаратуры, пераемнасць сучаснага этапу літаратурнага развіцця, творчае ўзбагачэнне, эстэтыка-выяўленчы кірунак, традыцыйныя духоўныя каштоўнасці, сучаснае прачытанне літаратурнай спадчыны, літаратурна-выдавецкі працэс, культурная прастора, творчае аб’яднанне, літаратурная суполка, авангардныя пошукі, сучасная літаратура і інтэрнэт, літаратурны блог, літаратурная прэмія.

ПЫТАННІ ДЛЯ АБМЕРКАВАННЯ:

2. Сучасная літаратура Беларусі і праблемы ў задавальненні запытаў карыстальнікаў. Шляхі іх вырашэння.

ЛІТАРАТУРА:

1. Бароўка, В. Ю. Аксіялогія беларускай літаратуры : манаграфія / В. Ю. Бароўка. – Віцебск : ВДУ, 2020. – 183 с.

2. Пісарэнка, А. М. “Слова – усяго аснова”: мова і літаратура як важнейшыя сродкі ў прафесійнай падрыхтоўцы работнікаў сферы культуры [Электронный ресурс] / А. М. Пісарэнка, В. С. Варапаева // Практико-ориентированный подход в подготовке специалистов сферы культуры : материалы науч.-метод. конф. профессорско-преподавательского состава, 1 февраля 2018 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск, 2018. – 1 элект. опт. диск (CD-ROM). – Депонировано в БГУКИ 19.12.2018, № 035519122018. – Режим доступа: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/19907?show=full. – Дата доступа: 03.06.2022.

3. Слова і сучаснасць : праблемы функцыянавання беларускай літаратуры ва ўмовах глабалізацыі, рынку, масавай культуры літаратуры [Электронны рэсурс] / П. В. Васючэнка [і інш. ]. – Мінск : МДЛУ, 2017. – 155 с. – Рэжым доступу: https://e-catalog.nlb.by/Record/BY-NLB-br0001438987. – Дата доступу: 03.06.2022.

4. Шамякина, Т. И. Психология литературного творчества [Электронный ресурс] : учеб-метод. пособие / Т. И. Шамякина. – Минск : БГУ, 2021. – Режим доступа: https://elib.bsu.by/handle/123456789/273051. – Дата доступа: 03.06.2022.

## К р у г л ы   с т о л

## Тэма 2.1 Гістарычныя асаблівасці развіцця полілінгвізму. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі

*Ключавыя словы:* полілінгвізм, папулярызатары беларускай мастацкай літаратуры, выхад за межы нацыянальнай традыцыі, міжнародныя літаратурныя сувязі і кантакты, рускамоўная літаратура Беларусі, літаратурны друк на рускай мове, адметныя прадстаўнікі рускамоўнай паэзіі, прозы, драматургіі, чытацкія запатрабаванні, спажывецкі попыт.

ПЫТАННІ ДЛЯ АБМЕРКАВАННЯ:

1. Роля і месца рускамоўнай літаратуры ў літаратурным працэсе Беларусі.
2. Адметнасць чытацкага попыту на рускамоўную літаратуру Беларусі.

ЛІТАРАТУРА:

1. Булацкая, Н. А. Да пытання аб нацыянальна-беларускім успрыманні рускай літаратуры [Электронны рэсурс] / Н. А. Булацкая // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : сб. науч. ст. : XII Межд. науч.-практ. конф., Минск, 3 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2018. – Вып. 12. – С. 122–125. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/18981?show=full. – Дата доступу: 03.06.2022.

2. Драздова, З. У. Маляўнічая сіла слова : беларуская і руская проза XX–XXI ст.: параўнальна-тыпалагічны кантэкст / З. У. Драздова. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 256 с.

3. Жиганова, М. П. “Спешите медленнее жить…” А. Ю. Аврутин : жизнь и творчество / М. П. Жиганова. – Брест : БрГТУ, 2018. – 271 с.

## 3.2 РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ І ПРАВЯДЗЕННЮ КРУГЛЫХ СТАЛОЎ

### К р у г л ы   с т о л

**Тэма 1.1 Сучасная літаратура Беларусі як аб’ект рэцэпцыі: своеасаблівасць мадэлявання ў прасторы культуры**

*Мэта*: разгляд адметнасці сучаснай літаратуры Беларусі ў прасторы культуры, актуальных вектараў яе развіцця і выкарыстання шляхам абмеркавання назіранняў, атрыманых у выніку аналітычнага агляду.

*Задачы*:

вывучэнне актуальных вектараў развіцця сучаснай літаратуры Беларусі, яе мадэлявання ў прасторы культуры; вызначэнне яе ролі абмеркаванне праблем у задавальненні чытацкага попыту і шляхоў іх вырашэння.

*Парадак узаемадзеяння*:

1. Адкрыццё круглага стала.
2. Прэзентацыя тэмы, мэты і задач круглага стала.
3. Прэзентацыя пытанняў круглага стала.
4. Абмеркаванне пытанняў круглага стала:
   2) Сучасная літаратура Беларусі і праблемы ў задавальненні запытаў карыстальнікаў. Шляхі іх вырашэння.
5. Абагульненне вынікаў круглага стала.

### К р у г л ы   с т о л

**Тэма 2.1 Гістарычныя асаблівасці развіцця полілігвізму. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі**

*Мэта*: асваенне спецыфікі рускамоўнай літаратуры Беларусі шляхам абмеркавання назіранняў, атрыманых у выніку аналітычнага агляду.

*Задачы*:

даследаванне адметнасці рускамоўнай літаратуры Беларусі ў літаратурным працэсе;

вызначэнне актуальных аспектаў чытацкага попыту на выданні рускамоўнай літаратуры Беларусі.

*Парадак узаемадзеяння*:

1. Адкрыццё круглага стала.
2. Прэзентацыя тэмы, мэты і задач круглага стала.
3. Прэзентацыя пытанняў круглага стала.

4. Абмеркаванне пытанняў круглага стала:
    1) Роля і месца рускамоўнай літаратуры ў літаратурным працэсе Беларусі.
    2) Адметнасць чытацкага попыту на рускамоўную літаратуру Беларусі.
5. Абагульненне вынікаў круглага стала.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 ЗАДАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СЛУХАЧОЎ

### Тэма 1.2 Ідэйна-эстэтычная і стылявая адметнасць сучаснай беларускай паэзіі

*Ключавыя словы:* ідэйна-эстэтычная адметнасць, стылявая адметнасць, эксперыментальная паэзія, інтэрактыўныя формы паэзіі, паэтычныя слэмы, відэавершы, культурна-адукацыйная дзейнасць бібліятэкі, культурна-адпачынкавая дзейнасць бібліятэкі.

*Заданне:* даследаваць адметнасць форм сучаснай беларускай эксперыментальнай паэзіі, інтэрактыўных яе форм (паэтычныя слэмы, відэавершы і інш.), і вызначыць спосабы іх прымянення ў культурна-адукацыйнай і культурна-адпачынкавай дзейнасці бібліятэкі.

*Пытанні для самакантролю:*

1. Жанравая і тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.
2. Асноўныя эстэтычна-стылявыя плыні беларускай паэзіі (лірыка-апавядальная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная, інтэлектуальная).
3. Паэтычныя слэмы як інтэрактыўная з’ява сучаснага літаратурнага жыцця.
4. Відэавершы як злучэнне традыцыйнага віду літаратурнай творчасці з тэхналагічнымі магчымасцямі інфармацыйнага грамадства.

ЛІТАРАТУРА:

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 39–87.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 3. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – С. 36–87.
3. Мартынкевіч, С. В. Беларуская мова і літаратура : метадычныя рэкамендацыі / С. В. Мартынкевіч. – Віцебск : ВДУ, 2021. – 59 с.
4. Пісарэнка, А. М. “Слова – усяго аснова”: мова і літаратура як важнейшыя сродкі ў прафесійнай падрыхтоўцы работнікаў сферы культуры [Электронный ресурс] / А. М. Пісарэнка, В. С. Варапаева // Практико-ориентированный подход в подготовке специалистов сферы культуры : материалы науч.-метод. конф. профессорско-преподавательского состава, 1 февраля 2018 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск, 2018. – 1 элект. опт. диск (CD-ROM). – Депонировано в БГУКИ 19.12.2018, № 035519122018. – Режим

доступа: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/19907?show=full. – Дата доступа: 03.06.2022.

5. Садко, Л. М. Белорусская экспериментальная поэзия второй половины XX – начала XXI века и немецкоязычный конкретизм : монография / Л. М. Садко. – Брест : БрГУ, 2018. – С. 4–21.

**Тэма 1.3 Жанравая і тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай прозы**

*Ключавыя словы:* жанравая сістэма сучаснай беларускай прозы, тэматычная адметнасць сучаснай беларускай прозы, гістарыяграфічны метараман, фэнтэзі, экалагічная казка, філалагемы, фрэскі, мроі, жыццясны.

*Заданне:* даследаваць адметныя формы сучаснай беларускай прозы, такія як беларускі гістарыяграфічны метараман, фэнтэзі, экалагічная казка і інш., заканспектаваць найменні выданняў для далейшага выкарыстання ў практычнай дзейнасці.

*Пытанні для самакантролю:*

1. Разнастайнасць жанравай сістэмы сучаснай беларускай прозы.
2. Нараджэнне новых жанраў у сучаснай беларускай прозе (філалагемы, фрэскі, мроі, жыццясны і інш.).
3. Фантастычны элемент у сучаснай беларускай прозе.

ЛІТАРАТУРА:

1. Слова і сучаснасць : праблемы функцыянавання беларускай літаратуры ва ўмовах глабалізацыі, рынку, масавай культуры літаратуры [Электронны рэсурс] / П. В. Васючэнка [і інш. ]. – Мінск : МДЛУ, 2017. – С. 14–21, 21–27, 27–37. – Рэжым доступу: https://e-catalog.nlb.by/Record/BY-NLB-br0001438987. – Дата доступу: 03.06.2022.

2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 8–38.

3. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 3. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – С. 8–35.

4. Навасельцава, Г. В. Жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя : манаграфія / Г. В. Навасельцава. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2020. – 268 с.

**Тэма 1.4 Традыцыі і наватарства сучаснай беларускай драматургіі**

*Ключавыя словы:* тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі, гістарычныя рэтраспекцыі, паэтыка мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага тэатра, драматургічны “поп-арт”, п’еса-прытча, п’еса-фантасмагорыя, п’еса-містыфікацыя, п’еса-казка для дарослых, “рыцарская” п’еса.

*Заданне*: даследаваць адметныя формы сучаснай беларускай драматургіі, такія як гістарычная драма і гістарычнае фэнтэзі, драматургічны “поп-арт”.

*Пытанні для самакантролю:*

1. Агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі.
2. Драматургічны “поп-арт”.
3. Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі (п’еса-прытча, п’еса-фантасмагорыя, п’еса-містыфікацыя, п’еса-казка для дарослых).

ЛІТАРАТУРА:

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 88–116.
2. Слова і сучаснасць : праблемы функцыянавання беларускай літаратуры ва ўмовах глабалізацыі, рынку, масавай культуры літаратуры [Электронны рэсурс] / П. В. Васючэнка [і інш. ]. – Мінск : МДЛУ, 2017. – 155 с. – Рэжым доступу: https://e-catalog.nlb.by/Record/BY-NLB-br0001438987. – Дата доступу: 03.06.2022.

**Тэма 2.1 Гістарычныя асаблівасці развіцця полілігвізму. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі**

*Ключавыя словы:* полілінгвізм, літаратура беларускага замежжа, рускамоўная літаратура Беларусі, роля і месца рускамоўнай прозы ў літаратурным працэсе, жанрава-стылявая разнастайнасць рускамоўнай паэзіі, рускамоўная драматургія на мяжы XX – XXI стст.

*Заданне*: даследаваць ролю і месца рускамоўнай літаратуры ў літаратурным працэсе Беларусі, вызначыць яе чытацкі попыт; назіранні заканспектаваць.

*Пытанні для самакантролю:*

1. Вызначыце ролю і месца рускамоўнай літаратуры ў літаратурным працэсе Беларусі, яе чытацкі попыт.
2. Назавіце прадстаўнікоў сучаснай рускамоўнай прозы.
3. Рускамоўная паэзія: жанрава-стылявая разнастайнасць.
4. Рускамоўная драматургія на мяжы XX – XXI стст.

ЛІТАРАТУРА:

1. Булацкая, Н. А. Да пытання аб нацыянальна-беларускім успрыманні рускай літаратуры [Электронны рэсурс] / Н. А. Булацкая // Культура. Наука. Творчество = Культура. Навука. Творчасць = Culture. Science. Arts : сборник научных статей : XII Межд. науч.-практ. конф., Минск, 3 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2018. – Вып. 12. – С. 122–125. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by:8080/handle/123456789/18981?show=full. – Дата доступу: 03.06.2022.

2. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ-ры імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – Т. 4. – Кн. 2. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – С. 701–771.

**Тэма 2.2 Мастацкая літаратура ў перакладзе**

*Ключавыя словы:* сутнасць мастацкага перакладу, перакладазнаўства, віды мастацкага перакладу, аўтарскі, аўтарызаваны, даслоўны, падрадковы, рэалістычны пераклад, умовы і цяжкасці мастацкага перакладу, празаічны і паэтычны пераклад, эквіметрычнасць, эквірыфменнасць і эквілінеарнасць, творчая індывідуальнасць перакладчыка, беларуская школа мастацкага перакладу.

*Заданне*: вызначыць шляхам правядзення аналізу літаратурна-крытычных работ набыткі сучаснага беларускага мастацкага перакладу, пазначыць назвы перакладных твораў і даследаванняў у галіне мастацкага перакладу апошняга дваццацігоддзя.

*Пытанні для самакантролю:*

1. Перакладчыцкія структуры і выданні.
2. Пераклад на беларускую мову славутых паэтаў і пісьменнікаў славянскага свету.
3. Назавіце перакладныя творы апошняга дваццацігоддзя.
4. Адметнасць творчай дзейнасці найбольш значных прадстаўнікоў сучаснага беларускага мастацкага перакладу.

ЛІТАРАТУРА:

1. Лапцёнак, І. Б. Праблема эквівалентнасці ў паэтычным перакладзе / І. Б. Лапцёнак // Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : вучэб.-метад. дапам. / склад. А. У. Вострыкава [і інш.] ; пад рэд. В. П. Рагойшы, І. А. Чароты. – Мінск : БДУ, 2020. – С. 110–127.

2. Тарасава, К. А. Беларускі мастацкі пераклад як сродак утварэння міжнародных літаратурных сувязяў / К. А. Тарасава // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы XIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нарадж. чл.-кар. НАН Беларусі праф. А. А. Лойкі,

Мінск, 28–29 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Важнік (гал. рэд.) [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Бельскі. – Мінск : БДУ, 2021. – С. 209–212.
3. Якавенка, Н. В. Мастацкі пераклад з роднасных моў у гісторыі беларускай літаратуры / Н. В. Якавенка ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2019. – С. 22–46.

## 4.2 ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

1. Роля прадстаўнікоў “філалагічнага пакалення” ў развіцці беларускай літаратуры.

2. Крытыка і літаратуразнаўства: асноўныя кірункі даследавання на сучасным этапе.

3. Адметнасць розных эстэтыка-выяўленчых кірункаў, плыняў, тэндэнцый у сучаснай літаратуры (рэалізму, неарамантызму, авангардызму, імпрэсіянізму, постмадэрнізму).

4. Уплыў чарнобыльскай трагедыі на погляды і светаадчуванне беларускіх пісьменнікаў.

5. Уплыў “вернутай літаратуры” на літаратурны працэс канца ХХ ст.

6. Літаратурна-выдавецкі працэс у сучаснай Беларусі (СМІ ў беларускай культурнай прасторы, літаратурны перыядычны друк).

7. Творчыя аб’яднанні і літаратурныя суполкі (“Узлёт”, “Тутэйшыя”, “Бум-Бам-Літ”, “Літаратурнае прадмесце” і інш.).

8. Сучасная літаратура і інтэрнэт як новы спосаб узаемаадносін з чытачом.

9. Літаратурныя блогі ў інтэрнэце: новыя формы і жанры.

10. Жанравая і тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.

11. Асноўныя эстэтычна-стылявыя плыні беларускай паэзіі (лірыка-апавядальная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная, інтэлектуальная).

12. Традыцыя філасафізму і яе ўплыў на сучасную паэзію.

13. Інтэлектуальна-філасофская плынь у паэзіі.

14. Адлюстраванне біблейска-філасофскіх, рэлігійна-хрысціянскіх і экзістэнцыяльных матываў у сучаснай паэзіі.

15. Багацце духоўнага зместу ў лірыцы кахання.

16. Адметнасць сучаснай жаночай паэзіі.

17. Творчасць бумбамлітаўцаў. Пошукавы характар іх паэзіі.

18. Паэтычныя слэмы як інтэрактыўная з’ява сучаснага літаратурнага жыцця.

19. Відэавершы як злучэнне традыцыйнага віду літаратурнай творчасці з тэхналагічнымі магчымасцямі інфармацыйнага грамадства.

20. Разнастайнасць жанравай сістэмы сучаснай беларускай прозы.

21. Нараджэнне новых жанраў у сучаснай беларускай прозе (філалагемы, фрэскі, мроі, жыццясны і інш.).

22. Тэма гістарычнага мінулага ў беларускай прозе.

23. Мінулае Беларусі ў творчасці У. Караткевіча, наватарства пісьменніка і яго ўплыў на прадстаўнікоў маладзейшых літаратурных пакаленняў.

24. Новыя падыходы ў мастацкім асэнсаванні ваеннага мінулага.

25. Асаблівасць сучаснай аўтабіяграфічнай прозы.

26. Чарнобыльская трагедыя і экалагічная тэматыка ў творах В. Казько, А. Жука, В. Карамазава, І. Пташнікава, І. Шамякіна і інш.

27. Карціны вясковага жыцця ў творах сучаснай літаратуры Беларусі.

28. Адлюстраванне ўрбанізаванага жыцця і побыту ў творах сучаснай літаратуры Беларусі.

29. Іранічны сац-арт.

30. Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры. Праблематыка і асаблівасці аўтарскай канцэпцыі ў творах прадстаўнікоў сучаснай літаратуры Беларусі.

31. Сучасная “спавядальная” проза.

32. Фантастычны элемент у сучаснай беларускай прозе.

33. Сучасная беларуская проза для падлеткаў.

34. Набліжэнне рэалістычных твораў да парабалы, прытчы, алегорыі, прыпавесці і метафары ў сучаснай літаратуры.

35. Фармальна-стылявыя пошукі і эксперыменты ў сучаснай прозе.

36. Сучасны беларускі гістарыяграфічны метараман.

37. Агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі.

38. Гістарычныя рэтраспекцыі, інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных падзей і асоб у творах беларускіх драматургаў.

39. Тэндэнцыі засваення паэтыкі мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага тэатра.

40. Драматургічны “поп-арт”.

41. Надзённыя канфлікты жыцця і спецыфіка іх вырашэння ў творах сучаснай літаратуры.

42. Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі (п’еса-прытча, п’еса-фантасмагорыя, п’еса-містыфікацыя, п’еса-казка для дарослых).

43. “Рыцарская” п’еса.

44. Набыткі драматургаў новай генерацыі.

45. Праблемы рэпрэзентацыі твораў драматургіі.

46. Сітуацыя полілінгвізму ў літаратуры Беларусі.

47. Стварэнне мастацкіх твораў на розных мовах.

48. Літаратура беларускага замежжа.

49. Вызначыце ролю і месца рускамоўнай літаратуры ў літаратурным працэсе Беларусі, яе чытацкі попыт.

50. Назавіце прадстаўнікоў сучаснай рускамоўнай прозы.

51. Рускамоўная паэзія: жанрава-стылявая разнастайнасць.

52. Рускамоўная драматургія на мяжы XX – XXI стст.

53. Тэндэнцыі развіцця сучаснага літаратурнага перакладу ў Беларусі.

54. Дзейнасць беларускіх перакладчыкаў.

55. Крытыка мастацкага перакладу.

56. Перакладчыцкія структуры і выданні.

57. Пераклад на беларускую мову славутых паэтаў і пісьменнікаў славянскага свету.

58. Назавіце перакладныя творы апошняга дваццацігоддзя.

59. Адметнасць творчай дзейнасці найбольш значных прадстаўнікоў сучаснага беларускага мастацкага перакладу.

60. Спосабы папулярызацыі нацыянальнай літаратуры ў дзейнасці бібліятэкара-бібліёграфа.

## ТЭСТ-ВІКТАРЫНА ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

1. У пасляваенны час І. Шамякін напісаў раман, які стаў адным з першых твораў у беларускай літаратуры, прысвечаных партызанскай барацьбе. Прыгадайце назву гэтага рамана.

2. У якім творы В. Быкаў апісаў трагічныя падзеі, у час якіх ён цудам застаўся жывы?

3. Хто з кінарэжысёраў у 1986 годзе зняў паводле аповесці “Знак бяды” В. Быкава аднайменны фільм?

4. За што Н. Гілевіч узнагароджаны балгарскім ордэнам Кірыла і Мяфодзія 1-й ступені і ордэнам Югаслаўскай Зоркі са стужкай?

5. Назавіце беларускіх пісьменнікаў, атрымаўшых ганаровае званне народнага паэта, народнага пісьменніка Беларусі.

6. Як крытыкі называюць літаратурнае пакаленне, да якога адносіцца пісьменнік Р. Барадулін?

7. Вызначце ідэйна-мастацкую спецыфіку твораў У. Караткевіча: аповесцей “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Цыганскі кароль”, “Сівая легенда”, раманаў “Каласы пад сярпом тваім”, “Леаніды не вернуцца да Зямлі”.

8. Якія фільмы створаны паводле сцэнарыяў А. Дударава?

9. Назавіце прозвішча аўтара, які здолеў пераадолець нарматыўнасць рэалістычнага метаду і аваладаць прыёмамі адкрытага, разняволенага мастацтва слова, вольна карыстаецца канонамі вершатворчасці, спалучае рытмічна ўпарадкаваную і празаічную мовы, стварае новыя арыгінальныя жанры.

10. Як называецца твор-мініяцюра з філасофскім зместам, напісаны без знакаў прыпынку, “кавалкамі” тэксту? Кожны “кавалак” мае свой сэнс.

11. Назавіце аўтара аповесці “Тартак”.

12. Што абазначае назва рамана В. Казько “Неруш”?

13. Які раман В. Карамазава прысвечаны экалагічнай тэме?

14. Аб чым распавядаецца ў рамане І. Шамякіна “Злая зорка”?

15. Хто з празаікаў прадстаўляе дэтэктыўна-прыгодніцкі жанр у сучаснай беларускай прозе?

16. Якім падзеям прысвечана драматычная паэма Р. Баравіковай “Барбара Радзівіл”?

17. Назавіце аўтара гістарычных п’ес “Князь Вітаўт”, “Палачанка”, “Чорная панна Нясвіжа”.

18. Вызначце тэму п’есы У. Бутрамеева “Страсці па Аўдзею”.

19. Прыгадайце творы і аўтараў эксперыментальнай плыні драматургіі.

20. Што такое рымейк? Назавіце аўтара п’ес-рымейкаў.

21. Якія паэтычныя вобразы ствараюць эстэтычную аснову верша “Роднае слова” Н. Гілевіча?

22. Які гурт выконвае песню на словы верша П. Броўкі “Александрына”?

23. Легенду аб якой птушцы выкарыстаў паэт у творы “Мая Бесядзь”?

24. Да якога жанру адносіцца твор “Над брацкай магілай”?

25. Верш “Родная мова” напісаны арыгінальнымі і вельмі рэдкімі ў паэзіі дзевяціорадкоўямі. Якую назву яны маюць?

26. Вызначце ідэю верша М. Танка “Каб ведалі”.

27. Як называецца верш, у аснову рытму якога пакладзена чаргаванне рытмастваральных кампанентаў?

28. Супраць чаго выступае М. Танк у вершы “Ave Maria”?

29. Што значыць назва апавядання Я. Брыля “Memento mori”?

30. У чым праяўляецца адметнасць версэтаў?

## 4.3 ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Мерапрыемствы дыягностыкі абумоўлены мэтамі і задачамі ў працэсе навучання, прадугледжваюць у дынаміцы ўзроўні засваення слухачамі вучэбнага матэрыялу і яго карэкціроўку.

*Функцыі педагагічнай дыягностыкі*:

выяўленне ўзроўню падрыхтоўкі слухачоў;

вызначэнне ступені рэалізацыі адукацыйнай праграмы;

адсочванне дынамікі развіцця слухачоў.

*Этапы педагагічнай дыягностыкі*:

падрыхтоўчы (падрыхтоўка матэрыялаў);

арганізацыйны (вызначэнне механізму правядзення дыягностыкі);

аналіз вынікаў дыягностыкі.

*Метады правядзення дыягностыкі*:

назіранне;

гутарка;

творчыя заданні;

тэсты.

*Віды кантролю*, што забяспечваюць высокую ступень дыягностыкі ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў слухачоў па вучэбнай дысцыпліне:

карэкціруючы кантроль: экспрэс-апытанні ў вуснай форме, гутаркі па пройдзеным матэрыяле ў рамках аўдыторных заняткаў;

канстатуючы кантроль: ацэнка выступленняў слухачоў з паведамленнямі падчас круглых сталоў;

самакантроль: ажыццяўляецца слухачамі пры выкананні заданняў для самастойнай работы (у тым ліку пры падрыхтоўцы да заняткаў).

Для слухачоў распрацаваны матэрыялы па самакантролю па кожнай тэме для самастойнага вывучэння, матэрыялы для выніковага самакантролю (у форме пытанняў, заданняў, тэста-віктарыны).

# 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
Н.У.Карчэўская
. .2022
Рэг. № ВД-___Пп/эвуч.

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА БЕЛАРУСІ

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
2-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія,
кваліфікацыя: бібліятэкар-бібліёграф,
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
ад 28.09.2020 № 260, рэг. № 25-13/126

Мінск, 2022

Распрацоўшчык праграмы:
І.Б. Лапцёнак, прафесар кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Рэкамендавана да зацвярджэння:

кафедрай культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 07.06.2022 № 33

Саветам Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 14.06.2022 № 6

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол пасяджэння ад 15.06.2022 № 5

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне “Сучасная літаратура Беларусі” прадугледжвае рэалізацыю патрабаванняў, устаноўленых адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па спецыяльнасці 2-23 02 71 “Бібліятэказнаўства і бібліяграфія”, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.09.2020 № 259.

Для вывучэння дысцыпліны “Сучасная літаратура Беларусі” прадугледжана 30 вучэбных гадзін, якія ўключаюць 16 вучэбных гадзін аўдыторных заняткаў (з іх 10 вучэбных гадзін – лекцыі, 2 вучэбныя гадзіны – практычны занятак, 4 вучэбныя гадзіны – круглы стол); 14 вучэбных гадзін – самастойная работа слухачоў.

Дысцыпліна “Сучасная літаратура Беларусі” згодна з вучэбным планам уваходзіць у кампанент установы адукацыі, дапаўняе і паглыбляе веды па важных практыкаарыентаваных аспектах агульнапрафесійных дысцыплін “Бібліятэчны фонд” (па камплектаванню бібліятэчнага фонду), фонду “Бібліяграфазнаўства” (па вызначэнню і задавальненню інфармацыйных патрэб карыстальнікаў бібліятэк), дысцыплін спецыяльнасці “Інфармацыйныя рэсурсы” (па выкарыстанню інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы), “Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне карыстальнікаў” (па павышэнню ўзроўню абслугоўвання розных груп карыстальнікаў бібліятэкі), “Культурна-адпачынкавая дзейнасць бібліятэкі” (па інфармацыйнаму забеспячэнню культурна-адпачынкавай дзейнасці бібліятэкі).

**Актуальнасць дысцыпліны** звязана з пастаноўкай пытанняў па фарміраванню фонду нацыянальнай літаратуры, правядзеннем культурнай-асветнай работы, накіраванай на садзейнічанне культурнаму развіццю карыстальнікаў бібліятэк, распаўсюджанне гуманістычных ідэй і дасягненняў сучаснай літаратуры Беларусі.

**Мэта**: фарміраванне кампетэнцый, звязаных з выяўленнем і рэалізацыяй інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэк, ажыццяўлення культурна-асветнай работы на аснове ведаў і ўменняў, атрыманых на аснове вывучэння заканамернасцей і асаблівасцей літаратурна-мастацкага працэсу сучаснага перыяду развіцця літаратуры Беларусі, яе ідэйна-эстэтычнай, стылявой, жанрава-тэматычнай, полілінгвістычнай і культурнай адметнасці.

**Задачы** праграмы:

даць слухачам веды па ідэйна-мастацкіх здабытках і творчых пошуках сучаснай літаратуры Беларусі;

сфарміраваць уяўленне аб асноўных літаратурных напрамках, жанрах і стылях беларускай літаратуры акрэсленага перыяду.

**Метады** навучання: праблемнае выкладанне, часткова пошукавы метад, інтэрактыўныя метады (дыскусія, дэбаты) і інш.

**Сродкі** навучання: вучэбныя, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, дыдактычныя матэрыялы; выданні твораў мастацкай літаратуры, у тым ліку перакладныя; мультымедыйныя матэрыялы (слайды, прэзентацыі).

**Форма атрымання адукацыі**: завочная.

**Формы вучэбных заняткаў**: лекцыі, практычныя заняткі, круглыя сталы.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў**.

У выніку асваення дысцыпліны "Сучасная літаратура Беларусі" ў слухача павінны быць сфарміраваны сацыяльна-асабовыя, акадэмічныя і прафесійныя кампетэнцыі.

*Патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асабовых кампетэнцый.*

Слухач павінен:

імкнуцца да самаразвіцця, валодаць уменнем самастойна збіраць і аналізаваць інфармацыю;

быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да літаратурнай спадчыны.

*Патрабаванні да фарміравання акадэмічных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

ведаць асновы забеспячэння бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк згодна з іх патрабаваннямі і інтарэсамі;

умець прымяняць тэарэтычныя веды ў галіне фарміравання бібліятэчнага фонду для рашэння практычных задач.

*Патрабаванні да фарміравання прафесійных кампетэнцый.*

Слухач павінен:

Ведаць шляхі і тэндэнцыі развіцця сучаснай літаратуры, асаблівасці творчай індывідуальнасці пісьменнікаў і перакладчыкаў, прадстаўнікоў сучаснай літаратуры Беларусі;

валодаць навыкамі аналітычнага разгляду разнастайных з'яў сучаснай літаратуры Беларусі ў непарыўнай сувязі з іх жанрава-стылістычнай і ідэйна-тэматычнай разнастайнасцю, спосабамі папулярызацыі нацыянальнай літаратуры ў прафесійнай дзейнасці.

У змест вучэбнай праграмы ўключаны матэрыялы для аўдыторнай работы з прымяненнем актыўных форм навучання і заданні для самастойнай работы.

*Кантроль самастойнай работы слухачоў* ажыццяўляецца падчас вучэбных заняткаў і самакантролю. Пытанні і заданні для самастойнай работы ўключаны ў матэрыялы для самакантролю.

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

### Раздзел 1 Асноўныя кірункі і жанры сучаснай літаратуры Беларусі

**Тэма 1.1 Сучасная літаратура Беларусі як аб'ект рэцэпцыі: своеасаблівасць мадэлявання ў прасторы культуры** (4 гадзіны, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 2 гадзіны – круглы стол)

Асноўныя тэндэнцыі развіцця літаратуры другой паловы 1950-х – першай паловы 1980-х гг.

Прыход у літаратуру прадстаўнікоў "філалагічнага пакалення": У. Караткевіча, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, С. Гаўрусёва, Б. Сачанкі, В. Адамчыка, І. Пташнікава, І. Чыгрынава, А. Грачанікава.

Сучасная крытыка і літаратуразнаўства: асноўныя кірункі даследавання на сучасным этапе. Праблематыка даследаванняў А. Адамовіча, Р. Бярозкіна, В. Кавалені, У. Калесніка, А. Лойкі, Г. Кісялёва, У. Гніламёдава, С. Лаўшука, М. Мішчанчука, А. Бельскага і інш.

Традыцыі і наватарства ў сучаснай літаратуры. Праблемы пераемнасці сучаснага этапу літаратурнага развіцця з папярэднім. Адметнасць розных эстэтыка-выяўленчых кірункаў, плыняў, тэндэнцый у сучаснай літаратуры: рэалізму, неарамантызму, авангардызму, імпрэсіянізму, постмадэрнізму і інш.

Адкрыццё праўды пра гісторыю народа і лёс чалавека ў XX ст. Уплыў чарнобыльскай трагедыі на погляды і светаадчуванне беларускіх пісьменнікаў. Трывога літаратуры пра вечныя духоўныя каштоўнасці, захаванне гуманізму. Уплыў "вернутай літаратуры" на літаратурны працэс канца XX ст. Сучаснае прачытанне літаратурнай спадчыны.

Літаратурна-выдавецкі працэс у сучаснай Беларусі. СМІ ў беларускай культурнай прасторы. Літаратурны перыядычны друк (газета "Літаратура і мастацтва", часопісы "Полымя", "Маладосць" і інш.).

Творчыя аб'яднанні і літаратурныя суполкі ("Узлёт", "Тутэйшыя", "Бум-Бам-Літ", "Літаратурнае прадмесце" і інш.).

Авангардныя пошукі творчай моладзі. Сучасная літаратура і інтэрнэт як новы спосаб узаемаадносін з чытачом. Літаратурныя блогі ў інтэрнэце: новыя формы і жанры. Сучасныя літаратурныя прэміі.

**Тэма 1.2 Ідэйна-эстэтычная і стылявая адметнасць сучаснай беларускай паэзіі** (4 гадзіны, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 2 гадзіны – самастойная работа)

Жанравая і тэматычная разнастайнасць беларускай паэзіі.

Эстэтычна-стылявыя плыні: лірыка-апавядальная, рамантычная, публіцыстычная, філасофска-аналітычная, мастацка-сінкрэтычная, інтэлектуальная (Л. Дранько-Майсюк, А. Бадак, Л. Рублеўская і інш.).

Паяднанне публіцыстычнага, філасофскага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у сучаснай лірыцы (П. Панчанка, Н. Гілевіч, С. Грахоўскі і інш.).

Традыцыя філасафізму і яе ўплыў на сучасную паэзію. Інтэлектуальна-філасофская плынь у паэзіі, адлюстраванне біблейска-філасофскіх, рэлігійна-хрысціянскіх і экзістэнцыяльных матываў (М. Танк, В. Зуёнак, С. Дзяргай, А. Русецкі, У. Караткевіч, А. Вярцінскі, П. Макаль і інш.). Сівая мінуўшчына і анталагічныя праблемы ў творчасці М. Арочкі, А. Лойкі, В. Жуковіча, В. Макарэвіча, В. Коўтун і інш. Сувязь сучаснай паэтычнай міфатворчасці з фальклорнай і біблейскай традыцыямі. Вобразы беларускай міфалогіі (М. Танк, Р. Барадулін, А. Мінкін, А. Сыс і інш.). Экалагічная тэма ў сучаснай беларускай паэзіі (М. Танк, Р. Барадулін, М. Мятліцкі, С. Законнікаў і інш.).

Багацце духоўнага зместу ў лірыцы кахання (Я. Янішчыц, Р. Баравікова, Г. Бураўкін, Л. Дранько-Майсюк і інш.). Адметнасць жаночай паэзіі (І. Багдановіч, Л. Рублеўская, Л. Сільнова і інш.).

Творчасць бумбамлітаўцаў. Калектыўны зборнік хоку беларускіх паэтаў "Круглы год" (1996). Паэзія маладых у зборніку "Літаратурны квартал" (2003) і інш. Паэтычныя слэмы як інтэрактыўная з'ява сучаснага літаратурнага жыцця. Відэавершы як злучэнне традыцыйнага віду літаратурнай творчасці з тэхналагічнымі магчымасцямі інфармацыйнага грамадства.

**Тэма 1.3 Жанравая і тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай прозы** (6 гадзін, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 4 гадзіны – самастойная работа)

Актывізацыя ідэйна-творчых пошукаў, пашырэнне выяўленчых магчымасцей сучаснай беларускай прозы. Разнастайнасць жанравай сістэмы сучаснай беларускай прозы.

Маладая беларуская проза і "еўрапеізм". Укараненне вядомых у свеце жанрава-стылявых форм. Нараджэнне новых жанраў (філалагемы, фрэскі, мроі, жыццясны і інш.).

Дакументалізм, аўтабіяграфізм і лірызм як выразныя рысы сучаснай прозы апошніх дзесяцігоддзяў. Тэматыка і праблематыка сучаснай прозы.

Тэма гістарычнага мінулага ў беларускай прозе (В. Іпатава, Л. Дайнека і інш.). Мінулае Беларусі ў творчасці У. Караткевіча, наватарства пісьменніка і яго ўплыў на прадстаўнікоў маладзейшых літаратурных пакаленняў. Новыя падыходы ў мастацкім асэнсаванні ваеннага мінулага (А. Адамовіч, В. Быкаў, І. Шамякін, І. Чыгрынаў і інш.). Асаблівасць сучаснай аўтабіяграфічнай прозы. Творы, напісаныя на мемуарным матэрыяле, звязаныя з рэпрэсіямі.

Чарнобыльская трагедыя, экалагічная тэматыка: творы В. Казько, А. Жука, В. Карамазава, І. Пташнікава, І. Шамякіна і інш. Карціны вясковага жыцця ў творах А. Жука, В. Казько, У. Гніламёдава і інш. Адлюстраванне ўрбанізаванага жыцця і побыту ў празаічных творах Іранічны сац-арт.

Дэтэктыўны жанр у беларускай літаратуры. Працяг традыцый У. Караткевіча: займальны сюжэт, прынцып загадкавасці, вострая інтрыга, незвычайнасць вобразаў. Праблематыка і асаблівасці аўтарскай канцэпцыі ў творах Л. Рублеўскай, М. Чаргінца і інш. Сучасная "спавядальная" проза.

Узбагачэнне беларускай фантастыкі. Фантастычны элемент у сучаснай беларускай прозе. Сучасная беларуская проза для падлеткаў.

Мастацкія метады ў творчасці пісьменнікаў (рэалізм, мадэрнізм, постмадэрнізм). Набліжэнне рэалістычных твораў да парабалы, прытчы, алегорыі, прыпавесці і метафары, схільнасць да міфатворчасці (В. Казько, В. Быкаў, Я. Сіпакоў і інш.). Літаратурныя прыпавесці (Я. Сіпакоў) і лірычныя мініяцюры (Я. Брыль). Тэндэнцыі постмадэрнізму і іх выяўленне ў творчасці пісьменнікаў. Фармальна-стылявыя пошукі і эксперыменты ў прозе.

**Тэма 1.4 Традыцыі і наватарства сучаснай беларускай драматургіі** (4 гадзіны, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 2 гадзіны – самастойная работа)

Агульныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнай драматургіі: пашырэнне тэматыкі, пошук новых жанравых форм, мастацкіх сродкаў увасаблення рэчаіснасці. Узмацненне ўвагі да набыткаў сусветнага драматургічнага і тэатральнага мастацтва.

Традыцыі нацыянальнай і сусветнай драматургіі ў п’есах з гістарычнай тэматыкай. Гістарычныя рэтраспекцыі, інтэрпрэтацыя рэальных гістарычных падзей і асоб у творах І. Чыгрынава, А. Дударава, А. Петрашкевіча, У. Бутрамеева, Р. Баравіковай і інш. Сатыра і гумар у камедыях. Сацыяльна-маральная завостранасць канфлікту.

Тэндэнцыі засваення паэтыкі мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага тэатра. Драматургічны “поп-арт”. Трансфармацыя рэальнасці, спалучэнне несумяшчальнага. Перапрацоўка вядомых сюжэтаў, матываў, вобразаў.

Надзённыя канфлікты жыцця, спецыфіка іх вырашэння ў творах.

Новыя жанравыя формы ў сучаснай беларускай драматургіі (п’еса-прытча, п’еса-фантасмагорыя, п’еса-містыфікацыя, п’еса-казка для дарослых). “Рыцарская” п’еса (Л. Рублеўская, П. Васючэнка і інш.). Набыткі і страты драматургаў новай генерацыі.

Праблемы рэпрэзентацыі твораў драматургіі.

## Раздзел 2 Полілінгвістычнасць літаратуры Беларусі і яе сувязі з іншымі літаратурамі свету

**Тэма 2.1 Гістарычныя асаблівасці развіцця полілігвізму. Сучасная рускамоўная літаратура Беларусі** (4 гадзіны, у тым ліку: 2 гадзіны – круглы стол, 2 гадзіны – самастойная работа)

Сітуацыя полілінгвізму ў літаратуры Беларусі. Стварэнне мастацкіх твораў на розных мовах: рускай, польскай, ідыш, іспанскай, нямецкай, курдскай, армянскай і інш. Літаратура беларускага замежжа як неад’емная частка нацыянальнага літаратурнага працэсу. Папулярызатары беларускай мастацкай літаратуры за мяжой: В. Жыдліцкі, Ч. Сэнюх, Н. Вылчаў і інш. Беларуская літаратура замежжа.

Выхад беларускай літаратуры за межы нацыянальнай традыцыі, падключэнне да эстэтычных сістэм еўрапейскага і сусветнага мастацтва. Міжнародныя літаратурныя сувязі і кантакты. Уганараванне дзяржаўнымі ўзнагародамі і літаратурнымі прэміямі іншых краін беларускіх пісьменнікаў. Выхад анталогій беларускай паэзіі ў Расіі, Балгарыі, Югаславіі і інш. Анталогія “Туга па Радзіме” (1992).

Літаратурны друк на рускай мове. Пісьменнікі, якія пісалі ці пішуць на дзвюх або некалькіх мовах.

Роля і месца рускамоўнай прозы ў літаратурным працэсе (А. Андрэеў, Э. Скобелеў, М. Чаргінец, У. Гніламёдаў і інш.). Рускамоўная паэзія: жанрава-стылявая разнастайнасць (В. Блажэнны, В. Паліканіна, А. Скарынкін і інш.). Рускамоўная драматургія на мяжы XX – XXI стст.

**Тэма 2.2 Мастацкая літаратура ў перакладзе** (8 гадзін, у тым ліку: 2 гадзіны – лекцыя, 2 гадзіны – практычны занятак, 4 гадзіны – самастойная работа)

Пераклад і ўзаемасувязі літаратур: набыткі, праблемы і перспектывы.

Тэндэнцыі развіцця сучаснага літаратурнага перакладу ў Беларусі. Фарміраванне і развіццё сучаснага беларускага мастацкага перакладу. Дзейнасць Ю. Гаўрука, Я. Семяжона, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, В. Сёмухі, К. Цвіркі і інш. Тэорыя мастацкага перакладу. Погляды С. Александровіча, М. Кенькі, В. Рагойшы, А. Яскевіча, П. Копанева і інш. Крытыка мастацкага перакладу. Артыкулы і рэцэнзіі М. Арочкі, Р. Бярозкіна, Л. Казыры, У. Калесніка, В. Небышынца, В. Нікіфаровіча, І. Чароты, К. Шэрмана і інш.

